1. Паслугі «Гасцявы Інэт 1 (7 дзён)», «Гасцявы Інэт 2 (7 дзён)», «Гасцявы Інэт 5 (7 дзён)» - гэта паслугі сотавай рухомай электрасувязі, якія даюць абаненту - фізічнай асобе, якая абслугоўваецца на тарыфным плане «Гасцявы 7», магчымасць без дадатковых утрыманняў акрамя кошту паслуг пры знаходжанні ў зоне дзеяння сеткі СТАА «Мабільныя ТэлеСістэмы» карыстацца мабільным інтэрнэт-трафікам сумарным аб'ёмам 1 ГБ, 2 ГБ, 5 ГБ на перыяд 7 дзён адпаведна.

2. Падключэнне паслуг «Гасцявы Інэт 1 (7 дзён)», «Гасцявы Інэт 2 (7 дзён)», «Гасцявы Інэт 5 (7 дзён)» (далей - Паслугі) даступнае толькі для абанентаў тарыфнага плана «Гасцявы 7».

3. Нявыкарыстаны на працягу 7 дзён інтэрнэт-трафік у рамках Паслуг не назапашваецца, на наступны перыяд не пераносіцца, эквівалент кошту не вяртаецца.

4. Пры наяўнасці адначасова некалькіх падключаных Паслуг, інтэрнэт-трафік у рамках гэтых паслуг падсумоўваецца. Грашовыя сродкі спісваюцца згодна з дзеючымі тарыфамі МТС за кожную з падключаных паслуг.

5. Пры наяўнасці адначасова падключаных Паслуг і пакетаў інтэрнэт-трафіка, якія набываюцца ў рамках праграмы «МТС-Бонус», у першую чаргу выдаткоўваюцца пакеты інтэрнэт-трафіка ў рамках праграмы «МТС-Бонус».

6. У абанентаў тарыфнага плана «Гасцявы 7», якія адначасова карыстаюцца Паслугамі, у першую чаргу выдаткоўваецца інтэрнэт-трафік у рамках тарыфнага плана.

7. Адначасова магчыма падключыць некалькі Паслуг.

8. Тарыфікацыя Паслуг ажыццяўляецца ў адпаведнасці з зацверджаным у МТС прэйскурантам тарыфаў на паслугі сувязі. Тарыф на Паслугу бярэцца ў поўным аб'ёме ў момант падключэння Паслугі.

9. Падключэнне Паслуг даступнае толькі пры ўмове дастатковасці сродкаў на асабовым рахунку абанента для спісання кошту Паслуг.

10. Падключэнне Паслуг даступнае толькі пры адсутнасці блакіроўкі на нумары абанента (частковай, прымусовай, добраахвотнай, блакіроўцы «Страта SIM-карты»).

11. У выпадку поўнага выдаткавання Інтэрнэт-трафіка ў рамках Паслуг, доступ у сетку Інтэрнэт будзе тарыфікавацца ў адпаведнасці з тарыфам на паслугу «Інтэрнэт (перадача / атрыманне даных) (за 1 Мб)» або ў адпаведнасці з іншымі падключанымі ў абанента Інтэрнэт-паслугамі.

12. Падключыць Паслугі можна адным з наступных спосабаў:
12.1. пры дапамозе тэхналагічных не тарыфікуемых USSD-запытаў:
12.1.1. «Гасцявы Інэт 1 (7 дзён)» *997#
12.1.2. «Гасцявы Інэт 2 (7 дзён)» *998#

12.1.3. «Гасцявы Інэт 5 (7 дзён)» *999#

12.2. пры дапамозе Інтэрнэт-памочніка;

12.3. праз мабільную праграму «Мой МТС»;

12.4. звярнуўшыся ў Цэнтры абслугоўвання абанентаў МТС і ў Гандлёвыя аб'екты камерцыйных прадстаўнікоў МТС.

13. Перыяд выдаткавання інтэрнэт-трафіка, прадугледжаны гэтымі Правіламі, вылічваецца са дня падключэння Паслуг. Каб далей карыстацца інтэрнэт- трафікам ў рамках названых паслуг, іх неабходна падключыць нанова.

14. Абанент можа даведацца пра рэшту дадзенага інтэрнэт-трафіка і тэрмін дзеяння пакета пры дапамозе USSD-запыту балансу *100#.

15. Падключаючы Паслугі, Абанент тым самым пацвярджае сваё азнаямленне і згоду з Правіламі іх аказання.